# Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А.Р. Лукашэнка накіраваў прывітанне ўдзельнікам XXV Міжнароднага форуму па інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогіях "ТІБО 2018.»

Сёння ў Мінску ўрачыста адкрыта XXV Міжнародная спецыялізаваная выстава «ТІБО 2018».

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А.Р. Лукашэнка накіраваў прывітанне ўдзельнікам XXV Міжнароднага форуму па інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогіях "ТІБО 2018.»:

«Дарагія сябры! Вітаю ўдзельнікаў і гасцей XXV Міжнароднага форуму «ТІБО 2018».

За чвэрць стагоддзя ён стаў важнай пляцоўкай міждзяржаўнага супрацоўніцтва, дзе дэманструюцца апошнія дасягненні ў сферы інфармацыйных тэхналогій.

Беларусь валодае высокім інавацыйным патэнцыялам і па праве лічыцца ІТ-краінай, якая найбольш дынамічна развіваецца у Цэнтральнай і Усходняй Еўропе. Мы ператвараем у жыццё прагрэсіўныя ідэі і рашэнні, актыўна залучаючы моладзь да будаўніцтва нашай лічбавай будучыні.

Перакананы, што форум надасць імпульс пашырэнню ўзаемадзеяння і партнёрскіх сувязяў у галіне, будзе спрыяць развіццю і ўкараненню перадавых тэхналогій.

Жадаю вам поспехаў у працы, новых перспектыўных праектаў і яркіх уражанняў ад гасціннай Беларусі».

**Source URL:** *https://mpt.gov.by/news/15-05-2018-3077*